# Пра народныя звычаі свята Саракі паведалі удзельнікі калектыву “Зорачкі” у сваім тэатралізаваным прадстаўленні



**На Саракі дзень з ноччу мераюцца, казалі ў народзе, і лічылі другой сустрэчай вясны. Першая была на Стрэчанне, а трэцяя адбывалася на Благавешчанне. 22 сакавіка гаспадыні пяклі пячэнне ў выглядзе птушак, частавалі ім дзяцей і пры гэтым казалі: “Жаваронaчкі прыляцелі, на галоўку дзецям селі”, а таксама крышылі яго для пярнатых жыхароў лясоў і палёў.**

Пра гэтыя і іншыя народныя звычаі, звязаныя са святам Саракі, жыхары і госці Урыцкага даведаліся падчас тэатралізаванага прадстаўлення, якое падрыхтавалі юныя артысты, удзельнікі калектыву “Зорачкі” Урыцкага рэгіянальнага цэнтра культуры і вольнага часу.



Згодна царкоўнага календара, 22 сакавіка адзначаецца дзень памяці сарака воінаў Севасційскіх, якія прынялі мукі за веру ў Хрыста. У народзе свята называюць Саракі, Сорак Саракоў, жаваронкі, альбо сорак святых. Гэтая лічба мела асноўнае значэнне ў абрадавых дзеяннях.

*— Прадвеснікамі вясны былі жаваронкі, аднак, па павер’ям, з цёплых краёў прылятали 40 відаў птушак. На думку нашых продкаў, іх трэба было пачаставаць, таму на свята Саракі выпякалі не менш і не больш, як 40 пячэнняў у выглядзе птушак,* — расказалі ўдзельнікі калектыву. *— А каб вясна хутчэй прыходзіла, людзі ладзілі карагоды і танцы, напрыклад, “Юрачка”, прыгаворвалі заклічкі, напрыклад, “Жавароначкі, прыляцíце” — так гукалі вясну.*

Артысты запрасілі гледачоў таксама прыняць удзел у некаторых дзеяннях тэатралізаванай пастаноўкі: пагуляць у старажытную гульню “Вырai”, адгадаць загадкі пра птушак, альбо ўспомніць прыказкі пра свята Саракі. Сярод якіх ёсць і такія: “На Саракі пайшла зіма да ракі”, “На Саракі прыляцелі з-за мора птахі”,

“На Саракі ў адзін дзень сорак маразоў”.



Узгадалі юныя аматары народнай творчасці і звычаі свята, якія бытавалі на тэрыторыі Гомельскага раёна. Напрыклад, жыхары Маркавіч у гэты дзень варажылі на трэсачках, дровах і плоце. А яшчэ ў гэтай вёсцы «гушкалі птушак»: на вялікую посцілку выкладвалі печыва ў выглядзе пярнатых. Усе браліся за краі, прыгаворвалі-запрашалі крылатых з выраю вярнуцца, і падкідвалі ўверх пячэнне. Фокус быў у тым, каб падкінуць яго як мага вышэй і пры гэтым не даць упасці на зямлю.

*— Лічылася, што за два дні да Благавешчання павінны прыляцець буслы — сімвал чысціні, шчасця і сямейнага дабрабыту,* — расказала Рыма Лянкова, мастацкі кіраўнік Урыцкага рэгіянальнага цэнтра культуры і вольнага часу. *— Да 7 красавіка забаранялася капаць зямлю, бо, на думку селяніна, толькі пасля гэтага свята зямля абуджалася, і можна ўжо было пачынаць палявыя работы.*

Птушкі вяртаюцца з выраю, значыць, вясна прыйшла! Яе надыходу

таксама паспрыялі юныя артысты з Урыцкага, якія ўзгадалі старажытны аўтэнтычны абрад і далі іншым дакрануцца да багатай народнай спадчыны.

http://sozhnews.by